Я.Купалы, Бабулі з п’есы Н.Думбадзе і Р.Лордкіпанідзе «Я, бабуля, Іліко і Іларыён», цёці Моці з «Машачкі» А.Афінагенава, Карміліцы з трагедыі У.Шэкспіра «Рамэа і Джульета».

Здольнасць Станюты зараджаць творчым патэнцыялам асобу адзначалі неаднаразова вядомыя дзеячы беларускай культуры. Знакаміты скульптар Заір Азгур успамінаў: «Яе постаць, на дзіва адточаныя рукі, дакладныя жэсты, гнуткі стан, дзівосна гарманічнае спалучэнне інтанацый мовы і мізансцэнічнай позы – усё падначалена ў яе, я сказаў бы, музыцы таго лёсу, аб якім расказвае яе роля ў сённешнім спектаклі» [3, с. 32 – 33].

Творчасць Стафаніі Станюты нязменна застаецца крыніцай біяфільства і аптымізму, якія фарміруюць дух *крытычнага аптымізму* беларускай філасофіі быцця.

**Спіс літаратуры:**


1. Фром Э. Душа человека / Э.Фром. – М.: Республика, 1992. – 430 с.
2. Гётэ Е.В. Фаўст / Ёган Вольфганг Гётэ. – Мінск: «Маст. Літ.», 1976. – 430 с.
3. Арлова Т. Купалаўцы / Таццяна Арлова. – Мінск: «Маст. Літ.», 1985. – 127 с.



***Вячаслаў Калацэй***


## БАЦЬКА «ЛЕГЕНДЫ»: АКАЛІЧНАСЦІ ЎЗАЕМАДНОСІН З НАРОДНЫМ МАСТАЦТВАМ У ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ МІХАСЯ СТАНЮТЫ

. Сярод найбольш уплывовых айчынных мастакоў 1920-1930-х імя Міхася Станюты (мал. 1) называюць аднім з першых з усходнебеларускіх майстроў (Міхась Філіповіч, Уладзімір Кудрэвіч, Гаўрыла Віер, С. Каўроўскі) і ўзгадваюць пры аналізе творчасці заходнебеларускіх (Пётр Сергіевіч, Язэп Драздовіч, Міхась Сяўрук, Раман Семашкевіч, Сяргей Вішнеўскі, Васіль Сідаровіч, Зміцер Крачкоўскі, Павел Южык). Як сцвярджаюць даследчыкі-мастацтвазнаўцы, творы гэтага «ўважлівага, сумленнага, дакладнага ў характарыстыках» мастака «не страцілі сваёй выразнасці і на сённяшні час» [1]. Міхась Станюта нарадзіўся 19 верасня ці 1 кастрычніка 1881 года ў горадзе Ігумене (цяпер Чэрвень) Мінскай губерні, вучыўся ў мастацкай студыі Кругера ў Мінску (1908-1911), Вышэйшых мастацка-тэхнічных майстэрнях у Маскве (1918-1920). Выкладаў маляванне ў школах, мастацкіх студыях і аб’яднаннях у Мінску (1920-1939). Станюта – ужо ў той час – быў прызнаным беларускім савецкім жывапісцам і педагогам, членам Усебеларускага аб'яднання мастакоў і Усебеларускага таварыства бібліяфілаў, высока ценімым аўтарам тэматычных карцін, пейзажаў і нацюрмортаў



*Малюнак 1* – М.Станюта. Аўтапартрэт.



*Малюнак 2* – М.Станюта. Партрэт дачкі.



*Малюнак 3* – М. Філіповіч. На Купаллі.



*Малюнак 4* – М.Станюта. Партрэт Філіповіча.

Аднак, нягледзячы на поспехі Станюты ў жанрах пейзажу, нацюрморту, тэматычных карцін, самая вядомая праца мастака – «Партрэт дачкі» (мал. 2), дзе намаляваная будучая народная артыстка БССР Стэфанія Станюта – легенда беларускай сцэны, актрыса тэатраў Галубка і Янкі Купалы [2]. Як лічаць даследчыкі, «Партрэт дачкі», створаны ў 1923 годзе (першапачатковая назва – «Эскіз да партрэта»), – прызнаны шэдэўр мастака. І не толькі таму, што на ім намаляваная Стэфанія Міхайлаўна Станюта (1905-2000) – у будучым народная артыстка Беларусі, актрыса Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, якому яна аддала каля сямідзесяці гадоў творчасці.

«Фальклорны» каларыт карціны відавочны: на ёй беларуская паненка з прыбранай «у традыцыі» галавой – дзвюма заплеценымі дзявочымі косамі, у светлай сукенцы, яе валасы перахвачаныя тканай тэкстыльнай стужкай. Як пазначаюць спецыялісты, «дзявочая чароўнасць мадэлі, яе прыгажосць і вытанчанасць дапамагаюць раскрыць каларыт працы – шматколерны, неспакойны, а таксама яе своеасаблівую арнаментальнасць. Палатно дыхае зіхатлівай юнацкасцю, верай у свае здольнасці і ў сваю мару, уласцівымі 18-гадовай актрысе, у той час – вучаніцы Беларускай драматычнай студыі ў Маскве» [1]. Пра стварэнне палатна «Партрэт дачкі» сама Стэфанія Станюта ўспамінала так «…аднойчы, калі ўлетку я адпачывала дома, бацька вырашыў напісаць мой партрэт – а можа, я сама прапанавала або папрасіла, і ўсё атрымалася хутка і проста, без падрыхтоўкі. У шэра-блакітнай сацінавай сукенцы з кароткімі рукавамі, з вузкім беларускім пояском на галаве,


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

я села на стале, падагнула ногі, абапіраючыся на стол рукамі і гледзячы некуды ў бок, а абедзве касы ляглі на калені. Хутчэй за ўсё, гэта я сама і прыдумала пазіраваць менавіта так, таму, што ўзгадваю, як рабіла «фон», развешваючы сінюю хустку і замацоўваючы на ёй нешта накшталт бантаў з чырвонай гафрыраванай паперы. Бацька ўзяў ліст паперы, прыкладна метр на паўметра, і за адзін або два сеансы гэты дэкаратыўна-плоскасны партрэт тэмперай быў гатовы» [1].

Безумоўна, Станюта не мог не бачыць таленту і патэнцыялу сваёй дачкі. Ці ведаў ён, што будзе бацькам будучай «легенды беларускага тэатру» і жанчыны, якая створыць на кінаэкране дакладны абагульняючы этнапсіхалагічны партрэт беларускі? Магчыма, ведаў. А яго перакананне пра яе здольнасць ствараць вобраз, прычым відавочна архітэпічны і глыбока народны, этнічны – прачытваецца на яго карціне. Цікава і, магчыма, невыпадкова, што па колеравай гаме і па арнаментыцы «Партрэт дачкі» пераклікаецца з відавочна этнаграфічна скіраванай карцінай «На Купаллі» Міхася Філіповіча (мал. 3).

Пэндзлю Станюты належыць і партрэт самога Філіповіча (мал. 4), з якім яны блізка сябравалі. Як вядома, сябар Станюты Міхась Філіповіч (1896-1947) – адзін з найбольш самабытных беларускіх жывапісцаў 1920-х гадоў, які меў вялікую прыродную адоранасць, пладавітасць, шырокія інтарэсы, а ў яго творчасці пераважалі нацыянальныя і этнаграфічныя тэмы. Міхась Філіповіч – не проста беларускі жывапісец і графік, але і этнограф, педагог, адзін з першых айчынных мастакоў, які звярнуўся да нацыянальнай тэматыкі і мэтанакіравана вывучаў узоры беларускага народнага мастацтва [3]. У выніку яго вандровак па Беларусі было складзена 10 альбомаў з замалёўкамі традыцыйнага тэкстылю, разьбы па дрэве, рэгіянальных народных строяў. Адна з першых карцін Філіповіча на народную тэматыку – «Казка» («Казачны сюжэт»), а ў 1921-1922 гг. ён стварае шэраг карцін на этнаграфічныя матывы: «На Купаллі», «Вясна», «Скокі праз вогнішча», «Карагод», «Народнае гулянне» [3].

У яго партрэце Станюта імкнецца захаваць і перадаць гледачу ў першую чаргу этнапсіхалогію беларуса (як дамінуючы складнік асобы Філіповіча): з характэрнай прыроднай мяккасцю, непасрэднасцю, даверлівасцю, сумным спакоем. У выніку – у яго ў чарговы раз атрымаўся глыбока псіхалагічны твор. Праца стрыманая па маляўнічым і кампазіцыйным рашэнні: глухі фон, пляскатасць малюнка, спакойны каларыт. Стэфанія Станюта ўспамінала: «…татаў партрэт Філіповіча: ён малады яшчэ, якім я яго памятаю ў пачатку дваццатых гадоў» [1]. Метатэкст мастацтва – складаная і цікавая справа. Часам, народны каларыт і этнапсіхалогія заўважны і без прамых спасылак і акцэнтаў, але для такога кшталту камунікацыі неабходны сапраўдны талент «адрасанта» паведамлення, якім Станюта, безумоўна, валодаў.

У балканскіх народаў, дзе вінаград ад глыбокай архаікі – адна з асноўных агракультур, сем'і, якія даюць на працягу некалькіх генерацый надзвычай карысных грамадзе асоб, – вельмі шануюць у народзе і завуць «святая лаза». Феномен роду Станютаў, які так шмат даў Беларусі, безумоўна, будзе цікавіць будучых прафесійных даследчыкаў-мастацтвазнаўцаў. Але, падаецца, надышоў час шукаць менавіта ў народнай тэрміналогіі дэфініцыю для пазначэння такіх феноменаў, каб мы маглі больш адэкватна ацэньваць спадчыну ўласнай культуры, яе глыбінныя і жыццяздольныя ўласцівасці.

**Спіс літаратуры:**


1. Бузенок, С.Ю. Михаил Петрович Станюта (1881−1974) / С.Ю. Бузенок [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : http://www.artmuseum.by/ru/vyst/virt/stanuta. – Дата доступу : 10.04.2015.
2. Галерея. Михаил Станюта [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : http://delaemvmeste.by/belorusskie-hudozhniki/mihail-stanyuta/. – Дата доступу : 10.04.2015.
3. Міхась Філіповіч [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : http://spadczyna.com/art/b_p_filipovich.htm. – Дата доступу : 10.04.2015.



***Вячаслаў Красулін***


## ВОБРАЗ ВЯСКОВАЙ ЖАНЧЫНЫ Ў КІНА- І ТЭАТРАЛЬНЫХ РОЛЯХ СТЭФАНІІ СТАНЮТЫ

Сярод выбітных дзеячоў у галіне айчыннага мастацтва XX стагоддзя вылучаецца постаць Стэфаніі Міхайлаўны Станюты, якой выпала стаць сведкам за свой жыццёвы шлях рэвалюцыі, сусветныя войны, змены ўладаў. Жыццёвы досвед Стэфаніі Міхайлаўны, безумоўна, адбіўся і на падыходзе да выбару сваіх роляў у тэатры, а потым і ў кінематографе. Адметныя рысы яе творчасці— шырыня дыяпазону, валоданне разнастайнымі сродкамі сцэнічнай выразнасці, яркі пластычны малюнак роляў, эмацыянальнасць, выразнасць слова, жэста, мімікі, уменне карыстацца ірoніяй, гратэскам.

Стэфанія Станюта зусім юнай прыйшла ў Першае таварыства беларускай драмы і камедыі, якое пазней стала Першым беларускім дзяржаўным тэатрам. Потым вучылася ў Маскве, у Беларускай драматычнай студыі. У 1926 году разам з аднакурснікамі прыехала ў Віцебск, дзе на базе іх выпуску быў створаны Другі беларускі драматычны тэатр. А з 1932 года і да апошніх дзён жыццё яе звязана з Нацыянальным тэатрам імя Янкі Купалы, тым, дзе яна пачынала яшчэ школьніцай. Знакавай роляй у купалаўскім тэатры, безумоўна, лічыцца «Паўлінка».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ